Belarus - Духу Сьвятым Пісаньне - Holy Spirit Scriptures

Мацьвея 12:28 А калі Я Духам Божым выганяю дэманаў, значыцца, дасягнула вас Валадарства Божае.
Мацьвея 28:19 Дык ідзіце, вучыце ўсе народы, хрысьцячы іх у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа,
Марка 1:10 І адразу, як выходзіў з вады, убачыў адкрытае неба і Духа як галуба, што зыходзіў на Яго.
Марка 13:11 І калі павядуць вас, каб выдаць, не клапаціцеся наперад, што маеце гаварыць, і не абдумвайце, але што дадзена вам будзе ў гэты час, тое кажыце, бо ня вы будзеце гаварыць, але Дух Сьвяты.
Лукі 2:26 І было яму сказана ад Духа Сьвятога, што ён ня ўбачыць сьмерці, пакуль ня ўбачыць Хрыста Госпадавага.
Лукі 4:1 Ісус, напоўнены Духам Сьвятым, вярнуўся з Ярдану і быў паведзены Духам у пустыню.
Лукі 4:18-21 Дух Госпада на Мне, бо Ён памазаў Мяне дабравесьціць убогім, паслаў Мяне аздараўляць скрышаных сэрцам, абвяшчаць вязьням вызваленьне і сьляпым — вяртаньне зроку, пусьціць змучаных на свабоду, 19. і абвяшчаць год Госпадаў прыемны. 20. І, згарнуўшы кнігу, аддаў паслугачу і сеў; і вочы ўсіх у сынагозе былі зьвернуты на Яго. 21. А Ён пачаў гаварыць ім: Сёньня споўнілася пісаньне гэтае ў вушах вашых.
Лукі 12:11,12 А калі прывядуць вас у сынагогі, і да начальнікаў, і да ўладаў, не клапаціцеся, як ці што будзеце адказваць, ці што будзеце гаварыць, 12. бо Дух Сьвяты навучыць вас у тую гадзіну, што мусіце гаварыць.
Яна 7:38,39 Хто верыць у Мяне, як сказана ў Пісаньні, у таго з жывата пацякуць рэкі вады жывое. 39. Гэта сказаў Ён пра Духа, Якога меліся прыняць тыя, якія вераць у Яго, бо не было яшчэ Духа Сьвятога, бо ня быў яшчэ Ісус праслаўлены.
Яна 14:16,17 І Я ўпрашу Айца, і Ён дасьць вам другога Абаронцу, каб заставаўся з вамі на вякі, 17. Духа праўды, Якога сьвет ня можа прыняць, бо ня бачыць Яго і не пазнаў Яго, а вы пазналі Яго, бо Ён з вамі застаецца і ў вас будзе.
Яна 14:26 Абаронца ж, Дух Сьвяты, Якога пашле Айцец у імя Маё, навучыць вас усяго і нагадае вам усё, што Я казаў вам.
Яна 16:7,8 Але Я праўду кажу вам: карысьней для вас, каб Я адыйшоў; бо калі Я не адыйду, Абаронца ня прыйдзе да вас, а калі пайду, пашлю Яго да вас, 8. і Ён, прыйшоўшы, будзе дакараць сьвет у грэху, праведнасьці і судзе;
Яна 16:13-15 Калі ж прыйдзе Ён, Дух Праўды, то будзе весьці вас да ўсякае праўды, бо не ад Сябе гаварыць будзе, але будзе гаварыць тое, што пачуе, і абвесьціць вам, што мае прыйсьці. 14. Ён праславіць Мяне, бо з Майго возьме і вам абвесьціць. 15. Усё, што мае Айцец, ёсьць Маё; таму

Я сказаў, што з Майго возьме і вам абвесьціць.
Яна 20:21,22 Тады Ісус сказаў ім ізноў: Супакой вам! Як паслаў Мяне Айцец, і Я пасылаю вас. 22. І, сказаўшы гэта, дыхнуў і кажа ім: Прыйміце Духа Сьвятога.
Дэеі 1:2,5 да таго дня, у які быў узьнесены, даўшы праз Духа Сьвятога загады апосталам, якіх выбраў, 5 што Ян хрысьціў вадою, а вы праз некалькі дзён будзеце ахрышчаны Духам Сьвятым.
Дэеі 1:8 але вы возьмеце сілу, як зыйдзе на вас Дух Сьвяты, і будзеце Мне сьведкамі ў Ерусаліме, і ў-ва ўсёй Юдэі і Самарыі, і нават да краю зямлі
Дэеі 2:1-4 І як надыйшоў дзень Пяцідзясятніцы, былі ўсе аднадушна разам. 2. І стаўся раптам шум з неба, быццам ад наляцеўшага гвалтоўнага ветру, і напоўніў увесь дом, дзе яны сядзелі. 3. І паказаліся ім падзеленыя языкі, быццам агнявыя, і паселі на кожным з іх. 4. І напоўніліся ўсе Духам Сьвятым, і пачалі гаварыць іншымі мовамі, як Дух даваў ім прамаўляць.
Дэеі 2:17-19 І будзе ў апошнія дні, — кажа Бог, — выльлю Духа Майго на ўсякае цела, і будуць прарочыць сыны вашыя і дочкі вашыя; і юнакі вашыя будуць бачыць відзежы, і старыя вашыя будуць сьніць сны. 18. І на слугаў Маіх і на служак Маіх выльлю ў тыя дні Духа Майго, і будуць прарочыць. 19. І дам цуды ў небе ўгары і знакі на зямлі ўнізе: кроў, і агонь, і куродым. (Ёэля 2:28,29)
Дэеі 2:33,38 Дык узьнесены правіцаю Бога і ўзяўшы ад Айца абяцаньне Сьвятога Духа, Ён выліў тое, што вы цяпер бачыце і чуеце. 38 Пётар жа прамовіў да іх: Навярніцеся, і няхай кожны з вас будзе ахрышчаны ў імя Ісуса Хрыста дзеля адпушчэньня грахоў, і возьмеце дар Сьвятога Духа.
Дэеі 4:31 І, як памаліліся, захісталася месца, дзе яны былі сабраўшыся, і ўсе былі напоўненыя Духам Сьвятым, і гаварылі слова Божае з адвагаю.
Дэеі 8:15-17 якія, прыйшоўшы, памаліліся за іх, каб атрымалі Духа Сьвятога, 16. бо Ён ня быў на нікога з іх зыйшоўшы, а толькі былі яны ахрышчаны ў імя Госпада Ісуса. 17. Тады яны ўсклалі на іх рукі, і яны атрымалі Духа Сьвятога.
Дэеі 8:39 Калі ж выйшлі яны з вады, Дух Госпадаў падхапіў Філіпа, і эўнух больш ня бачыў яго, бо паехаў у сваю дарогу, радуючыся. (1 Валадараоў 18:12)
Дэеі 9:31 А цэрквы па ўсёй Юдэі, і Галілеі, і Самарыі мелі супакой, будуючыся і ходзячы ў страху Госпадавым, і праз пацяшэньне Духа Сьвятога памнажаліся.
Дэеі 10:44,45 Калі Пётар яшчэ гаварыў словы гэтыя, зыйшоў Дух Сьвяты на ўсіх, якія слухалі слова. 45. І дзівіліся верныя з абрэзаных, якія прыйшлі з Пятром, што і на паганаў выліты дар Сьвятога Духа,
Дэеі 11:15 Калі ж я пачаў гаварыць, зыйшоў на іх Дух Сьвяты, як і на нас на пачатку.
Дэеі 13:52 А вучні былі напоўненыя радасьцю і Духам Сьвятым.
Дэеі 19:6 І, як усклаў Павал рукі на іх, зыйшоў на іх Дух Сьвяты, і гаварылі мовамі, і прарочылі.

Дэеі 20:23 адно Дух Сьвяты сьведчыць па гарадах, кажучы, што чакаюць мяне путы і прыгнёт.
Рымлянаў 5:5 а надзея ня ганьбіць, бо любоў Божая вылілася ў сэрцы нашыя праз Духа Сьвятога, Які нам дадзены.
Рымлянаў 8:9 Вы ж ня ў целе, але ў духу, калі толькі Дух Божы жыве ў вас. А калі хто Духа Хрыстовага ня мае, той не Ягоны.
Рымлянаў 8:13-16 бо калі вы жывяцё паводле цела, памрацё, а калі духам цялесныя ўчынкі забіваеце, жыць будзеце. 14. Бо ўсе, якія Духам Божым ведзеныя, ёсьць сыны Божыя. 15. Бо вы не атрымалі духа няволі ізноў на страх, але атрымалі Духа ўсынаўленьня, у Якім крычым: Абба, Ойча! 16. Гэты Дух сьведчыць духу нашаму, што мы — дзеці Божыя.
Рымлянаў 8:26 Гэтаксама і Дух дапамагае ў слабасьцях нашых, бо мы ня ведаем, пра што маліцца, як трэба, але Сам Дух заступаецца за нас стагнаньнямі невымоўнымі.
Рымлянаў 15:13 А Бог надзеі няхай напоўніць вас усякай радасьцю і супакоем у веры, каб памножыць у вас надзею моцаю Духа Сьвятога.
Рымлянаў 15:19 у моцы знакаў і цудаў, у моцы Духа Божага, так што Эвангельле Хрыстовае пашырана мною ад Ерусаліму і ваколіцы аж да Ілірыка.
1 Карыньцянаў 2:10-13 А нам Бог адкрыў праз Духа Свайго, бо Дух усё дасьледуе, і глыбіні Божыя. 11. Бо хто з людзей ведае, што ў чалавеку, акрамя духа чалавечага, які ў ім? Гэтак і таго, што ў Бога, ніхто ня ведае, акрамя Духа Божага. 12. А мы атрымалі ня духа сьвету, але Духа, Які ад Бога, каб ведаць, што падаравана нам ад Бога. 13. І гэта мы гаворым ня словамі, якімі навучыла мудрасьць чалавечая, але якіх навучыў Дух Сьвяты, параўноўваючы духоўнае з духоўным.
1 Карыньцянаў 3:16 Ці вы ня ведаеце, што вы — бажніца Божая, і Дух Божы жыве ў вас?
1 Карыньцянаў 6:11 І гэткімі былі некаторыя, але вы абмытыя, але вы асьвячоныя, але вы апраўданыя ў імя Госпада нашага Ісуса Хрыста і ў Духу Бога нашага.
1 Карыньцянаў 12:3 Дзеля гэтага паведамляю вам, што ніхто, хто гаворыць у Духу Божым, ня скажа праклёну на Ісуса; і ніхто ня можа назваць Ісуса Госпадам, як толькі ў Духу Сьвятым.
2 Карыньцянаў 3:17 Госпад ёсьць Дух, а дзе Дух Госпадаў, там свабода.
2 Карыньцянаў 13:14(13) Ласка Госпада Ісуса Хрыста, і любоў Божая, і супольнасьць Сьвятога Духа з усімі вамі. Амэн.
Галятаў 4:6 А як вы — сыны, Бог паслаў у сэрцы вашыя Духа Сына Свайго, Які кліча: Абба, Ойча!
Эфэсцаў 1:13,14 У Ім і вы, пачуўшы слова праўды, Эвангельле вашага збаўленьня, і паверыўшы ў Яго, запячатаныя абяцаным Духам Сьвятым, 14. Які ёсьць зарука спадчыны нашае на выкупленьне ўдзелу, на пахвалу славы Яго.
Эфэсцаў 2:18 бо праз Яго абодва маем доступ да Айца ў адным Духу.

Эфэсцаў 4:30 І не засмучайце Сьвятога Духа Божага, Якім вы запячатаныя на дзень адкупленьня.
1 Тэсалонцаў 4:8 Дык хто гэта адкідае, той адкідае не чалавека, але Бога, Які Духа Свайго Сьвятога нам даў.
1 Тэсалонцаў 5:19 Духа не гасіце.
2 Тэсалонцаў 2:13 А мы заўсёды павінны дзякаваць Богу за вас, улюбёныя Госпадам браты, што Бог ад пачатку, праз асьвячэньне Духа і веру праўдзе, выбраў вас на збаўленьне, (1 Пятра 1:2)
Ціта 3:5,6 Ён збавіў нас ня дзеля ўчынкаў праведнасьці, якія мы ўчынілі, але паводле літасьці Сваёй, праз лазьню адраджэньня і абнаўленьня Духам Сьвятым, 6. Якога Ён выліў на нас шчодра праз Ісуса Хрыста, Збаўцу нашага,
Гебраяў 2:4 якім засьведчыў Бог праз знакі, і цуды, і розныя сілы, і праз раздаваньне Духа Сьвятога паводле волі Яго?
Гебраяў 10:15 Сьведчыць жа нам і Дух Сьвяты, бо пасьля прадказана:
1 Пятра 1:2 паводле прадбачаньня Бога Айца, праз асьвячэньне Духа, дзеля паслухмянасьці і пакрапленьня крывёю Ісуса Хрыста: ласка і супакой няхай вам памножыцца!
2 Пятра 1:21 бо ніколі прароцтва не прыносілася воляй чалавека, але гаварылі яго сьвятыя Божыя людзі, ведзеныя Духам Сьвятым.
1 Яна 4:2 З гэтага вы пазнаеце Духа Божага: усякі дух, які прызнае Ісуса Хрыста, Які прыйшоў у целе, ёсьць ад Бога,
1 Яна 5:7,8 Бо тры сьведчаць у небе: Айцец, Слова і Сьвяты Дух, — і гэтыя тры ёсьць адно. 8. І тры сьведчаць на зямлі: дух, вада і кроў; і гэтыя тры — пра адно.
Юды 1:20 А вы, улюбёныя, будуючы сябе найсьвяцейшай верай вашаю, молячыся ў Духу Сьвятым,
Зыход 35:31 Духу Spirit of God, in wisdom, in understanding, and in knowledge, and in all manner of workmanship;
Лічбу 11:25 Духу Spirit of God on Moses put on 70 elders who prophesied.
Ёва 33:4 The Духу Spirit of God made me, and the Breath of the Almighty gave me life.
Ісая 11:2 the Духу Spirit of the LORD shall rest upon Him, the Духу Spirit of wisdom and understanding, the Духу Spirit of counsel and might, the Духу Spirit of knowledge and of the fear of the LORD;
Міхей 3:8 I am full of power by the Духу Spirit of the LORD, and of judgment, and of might,
Захарыя 4:6 Not by might, nor by power, but by My Духу Spirit, saith the LORD of hosts.

Pastor T. John Franklin
Church of Salvation, Healing, and Deliverance
COS-HAD.org